Падтрымай "Вясну" на PATREON

Бабруйск: Два гады пазбаўлення волі за гвалт над супрацоўнікам міліцыі

13.11.2020 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, сілавыя структуры



Суд над Ягорам Храменем. Фота: bobr.by

Вынесены прысуд па крымінальнай справе жыхара Бабруйска Ягора Храмені, якога вінавацілі ў гвалце над супрацоўнікам міліцыі (арт. 364 КК).

13 лістапада суддзя раённага суда **Антон Дудаль** прызнаў Храменю вінаватым і абвесціў прысуд: 2 гады пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму з выплатай маральнай шкоды ў памеры 1 000 рублёў.

Пацярпелы, супрацоўнік міліцыі **Дзмітрый Сакун** на папярэднім судовым пасяджэнні патрабаваў кампенсацыю ў памеры 5 тысяч рублёў.

Маладога бабруйчаніна абвінавачвалі ў тым, што ўвечары 9 жніўня ён "здзейсніў гвалт у дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў у мэтах перашкодзіць яго законнай дзейнасці". Гаворка ідзе пра ўдары ў галаву і распыленне пярцовага балончыка «Шок», якое прывяло да апёку сятчаткі вока.

"Гэтыя дзеянні Храмені кваліфікуюцца артыкулам 364 КК РБ" – паведамляла памочніца пракурора **Ірына Хадневіч.**

Яна запрасіла ў суда для абвінавачанага 4 гады пазбаўлення волі.

Адвакат рыхтуе апеляцыю на прысуд суда Бабруйскайга раёна.

Абвінавачанаму Ягору Храменю 22 гады, раней судзімы не быў, да заключэння пад варту працаваў на ААТ "Белшына" электрагазазваршчыкам, займаўся спортам. У матэрыялах справы ёсць некалькі хадайніцтваў з месца працы маладога бабруйчаніна, ад кіраўніка спартыўнай секцыі, і нават ад суседзяў па хаце. Усе яны характарызуюць хлопца як спакойнага, сумленнага, справядлівага.



Бабруйчаніна судзяць за гвалт у дачыненні да міліцыянта. Пазоўнік патрабуе кампенсацыю ў 5 тысяч рублёў

Паводле сайта bobr.by, на судзе малады бабруйчанін Ягор Храменя віну прызнаў часткова. Ён згодны з тым, што распыліў у твар патрульнага Дзмітрыя Сакуна пярцовы балончык, але адмаўляе ўдар у вуха. У справе толькі адзін сведка - Сяргей Кубар, напарнік пацярпелага.

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брэсце і Віцебску пасля рэйда па сансетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022



ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская Группа

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY